В 1911–1917 гг. журнал «К спорту» стал одним их популярных мест для публикации спортивных новостей из белорусских губерний. Спортивные результаты, имена молодых атлетов, характеристика инфраструктуры, сложности в организации физической культуры – весь спектр спортивной жизни региона был вынесен на страницы издания. По частоте упоминания белорусские губернии не отличались от других регионов Российской империи (уступая лишь признанным лидерам – Киеву, Одессе и Риге).

## Библиографический список


1. *Алексеев, К. А.* Развитие отделов спорта в изданиях общей тематики в XIX веке // Вестник Санкт-Петербургского университета. 2014. Сер. 9. Вып. 2. С. 180–188.
2. *Войтик, Е. А.* Спорт как тема в провинциальной прессе в XIX в. // Вестник Воронежского государственного университета. Филология. Журналистика. 2015. № 1. С. 84–87.
3. *Войтик, Е. А.* Спортивная тема в российской прессе в начале XIX века: принципы формирования информационного контекста // Журналистский ежегодник. 2014. № 1. С. 34–38.
4. *Гольберг, Я.* К положению военной авиации в России // К спорту. 1913. № 38. С. 13.
5. Госпожа Грейц // К спорту. 1912. № 56. С. 1.
6. *Лукосяк, Ю. П.* Динамика количества спортивных журналов в дореволюционной России (1860–1917 гг.) // Ученые записки университета имени П.Ф. Лесгафта. 2015. № 6. С. 128–132.
7. Обо всем. По России. Гомель // К спорту. 1913. № 2. С. 24.
8. По провинции. Лаун-теннис. Друскеники // К спорту. 1912. № 35. С. 16.
9. По провинции. Оссовец // К спорту. 1912. № 47. С. 19.
10. Провинция. Вильно // К спорту. 1914. № 27. С. 20.
11. Провинция. Гомель // К спорту. 1915. № 20. С. 15.
12. Провинция. Минск // К спорту. 1914. № 27. С. 18.
13. Провинция. Минск // К спорту. 1915. № 32. С. 14.
14. *Яцкевич, В.* Минск. Итоги летнего спортивного сезона // К спорту. 1915. № 50. С. 14.


УДК 930.2+476("18/20")

# СКАРГІ І ПРАШЭННІ ЯК КРЫНІЦЫ НА ГІСТОРЫІ ЗАБУДОВЫ БЕЛАРУСКІХ ГАРАДОЎ У КАНЦЫ XVIII – ПАЧАТКУ XX ст.

**Т. В. Даўгач**

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, вул. Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск, dauhach@gmail.com*

У артыкуле прапануецца аналіз інфармацыйнага парэнцыялу скаргаў і прашэнняў гарадскіх жыхароў ў апошняй трэці XVIII – пачатку XX ст. для вывучэння гісторыі трансфармацыйных працэсаў у беларускім грамадстве. Прапануецца разглядаць скаргі і прашэнні як эга-дакументы, у якіх вылучаецца «Я-канструкцыя», што дазваляе праз іх аналіз атрымаць уяўленне аб пэўных сацыяльна тыповых з’явах гістарычнай рэчаіснасці. У той жа момант яны ўтрымліваюць інфармацію і аб «беспрэцэдэнтна

асабістым», што дазваляе пераадолець схематызм у выкладанні гістарычных падзей, узбагаціць навуковыя працы, прысвечаныя горадабудаўніцтву, важнымі дэталямі.

***Ключавыя словы:*** скаргі; прашэнні; эга-дакументы; Расійская імперыя; горад; беларускія губерніі; горадабудаўніцтва.

# ЖАЛОБЫ И ПРОШЕНІЯ КАК ИСТОЧНИКИ ПО ИСТОРИИ ЗАСТРОЙКИ БЕЛОРУССКИХ ГОРОДОВ КОНЦА XVIII – НАЧАЛА XX в.

**Т. В. Долгач**

*Институт истории НАН Беларуси, ул. Академическая, 1, 220072, г. Минск, dauhach@gmail.com*

В статье предлагается анализ информационного потенциала жалоб и прошений городских жителей в последней трети XVIII – начале XX вв. Для изучения истории трансформационных процессов в белорусском обществе. Жалобы и прошения предлагается рассматривать как эго-документы, в которых выделяется «Я-конструкция», позволяющая через их анализ получить представление о тех или иных социально-типических явлениях исторической действительности. В то же время они содержат «беспрецедентно личную» информацию, позволяющую преодолеть схематизм в изложении исторических событий, обогатить важными подробностями научные труды, посвященные градостроительству.

***Ключевые слова:*** жалобы; прошения; эго-документы; Российская империя; города; белорусские губернии; градостроительство.

# COMPLAINTS AND REQUESTS AS SOURCES ON THE HISTORY OF THE BUILDING OF BELARUSIAN CITIES IN THE END OF THE 18$^{th}$ – BEGINNING OF THE XX CENTURIES

**T. Dauhach**

*Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, str. Akademichnaja, 1, 220072, Minsk, dauhach@gmail.com*

The article offers an analysis of the information pool of complaints and petitions of city residents in the last third of the 18th and early 20$^{th}$ centuries. to study the history of transformational processes in Belarusian society. It is proposed to consider complaints and requests as ego-documents, in which the “I-construction” is highlighted, which allows us to get an idea of certain socially typical phenomena of historical reality through their analysis. At the same time, they contain “unprecedentedly personal” information, which makes it possible to overcome schematism in the presentation of historical events, to enrich scientific works devoted to urban planning with important details.

***Keywords:*** complaints; requests; ego-documents; Russian Empire; Belarusian provinces; urban planning.

Беларускае грамадства ў апошняй трэці XVIII – пачатку XX ст. праходзіла праз значныя трансфармацыйныя працэсы. Рух ад традыцыйнага да сучаснага яго стану суправаджаўся пераўтварэннямі ва ўсіх сферах жыцця насельніцтва, аднак аднымі з найбольш заўважных сталі змены ў гарадской прасторы. За перыяд гэтак званага «доўгага XIX стагоддзя» беларускі горад пераадолеў сапраўдную эвалюцыю ад невялікай (па сучасных мерках), папярэдне ўмацаванай і досыць закрытай прасторы да шчыльна населенага капіталістычнага цэнтра, дзе віравала фінансавае жыццё, куды з магнацкіх рэзідэнцый былі перанесены шматлікія палітычныя і культурныя практыкі; да асяроддзя, якое вызначалася большым побытавым камфортам у параўнанні з іншымі населенымі пунктамі. Разам з ростам колькасці і памераў гарадоў змянялася і ўспрыманне гарадской прасторы чалавекам. Наблізіцца да разумення дадзеных змен можна праз аналіз скаргаў і прашэнняў гарадскога насельніцтва апошняй трэці XVIII – пачатку XX ст.

У межах дадзенага даследавання скаргі разумеюцца як афіцыйныя заявы аб непрымальных дзеяннях якой-небудзь асобы або ўстановы; пад прашэннямі разумеюцца пісьмовыя хадатайніцтвы аб чым-небудзь. У дакументаў дадзеных відаў досыць выразна адчуваецца наяўнасць так званай «Я-канструкцыі» – катэгорыі, якая дазваляе з той ці іншай ступенню верагоднасці даведацца аб светапоглядзе, успрыманні рэчаіснасці, жыццёвым досведзе і эмацыянальным стане асобы-стваральніка дакумента. У сувязі з гэтым прапануецца разглядаць скаргі і прашэнні як частку групы «эга-дакументаў».

Фармуляр скаргі або прашэння утрымлівае некалькі частак. *Першая* з якіх фіксуе адрасата – асобу або установу, якой накіраваны ліст. Згодна з нарматыўнымі практыкамі Расійскай імперыі, прашэнні адрасоўваліся тым установам, якія павінны былі вырашаць пытанні горадабудаўніцтва – губернскія праўленні, губернскія дарожныя і будаўнічыя камісіі (з 1833 г.), гарадскія думы. Часта, прашэнні або скаргі складаліся на імя губернатара, або наўпрост імператара. У *другой* частцы дакумента ўтрымліваецца намінатыўная інфармацыя аб адрасанце або адрасантах. У дадзенай частцы ўказана прыналежнасць заяўніка да саслоўнай групы (дваранін / мешчанін / жыхар горада), прыналежнасць да этнічнай ці канфесійнай супольнасці (яўрэй / хрысціянін / цыган); калі просьбіт з'яўляўся мешчанінам аднаго горада, але пражываў у іншым, дзе складаў скаргу або прашэнне, то гэта абавязкова пазначалася ў пачатку ліста; імя і прозвішча, магло таксама ўказвацца бацькоўскае імя. *Трэцяя* частка скаргі або прашэння ўтрымлівае асноўны змест, прадстаўлены, як правіла, згодна з наступнай схемай: прэамбула – аб'ява, пра што пойдзе гаворка, нарацыя – непасрэдна апісанне сутнасці праблемы, і дыспазіцыя – ўласна прашэнне аб пэўных распараджэннях. У *чацвёртай* частцы, якая завяршае дакумент, знаходзяцца подпісы заяўніка або заяўнікаў. Інфармацыя аб тым калі і дзе напісана скарга або прашэнне, можа знаходзіцца ў пачатку або ў канцы дакумента.

Адзначым, што дадзеныя крыніцы з’яўляюцца масавымі, і, адпаведна, праз іх аналіз можна атрымаць уяўленне аб пэўных сацыяльна тыповых з’явах гістарычнай рэчаіснасці. У той жа момант яны ўтрымліваюць інфармацыю і аб «беспрэцэдэнтна асабістым», што дазваляе пераадолець схематызм у выкладанні гістарычных падзей, узбагаціць навуковыя працы, прысвечаныя горадабудаўніцтву, важнымі дэталямі [4, с. 11]. Так, скаргі і прашэнні дапамагаюць пашырыць нашыя веды аб забудове гарадоў, скіраваўшы даследчыцкі інтарэс у бок вывучэння не толькі ўласна будаўніцтва дамоў, трасіроўкі вуліц, уладкавання прадпрыемстваў, але і тых праблем, з якімі сутыкалася тагачаснае насельніцтва у працэсе трансфармацыі гарадской прасторы. Акрамя гэтага, скаргі і прашэнні даюць магчымасць скласці уяўленне аб тым, як так званы «маленькі чалавек» – жыхар горада, мог уплываць на прастору, якая яго атачала. У гэтым кантэксце вялікую цікавасць уяўляе сфера найперш прыватнага будаўніцтва ў гарадах, вывучэнне якой немагчыма без аналізу пэўных эга-дакументаў, паколькі менавіта з прашэння аб дазволе на будаўніцтва дома пачынаўся справаводчы працэс, у выніку якога або задавальнялася хадатайніцтва просьбіта, або не. Улады маглі не задаволіць прашэнне аб будаўніцтве па розных прычынах, аднак асноўныя з іх – парушэнне нормаў Будаўнічага[1] статуту у праектным плане мяркуемага дому, не адпаведнасць плану так званым «узорным фасадам»[2]. Запаволіць або ускладніць працэс вынясення дазволу на будаўніцтва маглі скаргі суседзяў. Для ілюстрацыі скарыстаемся досыць распаўсюджаным сюжэтам скаргі. Так, жыхар Ліды Гірша Прускі ў 1838 г. паскардзіўся Віленскаму губернатару на памешчыка Банькоўскага, які набыў невялікі ўчастак зямлі на Віленскай вуліцы, побач з яго домам. Прускі сцвярджаў, што Банькоўскі будуе свой драўляны дом «*совершенно безобразно* (маецца на ўвазе, не адпаведна “узорным фасадам” – *заўвага аўтара*) *на меже моей земли и окнами на мой двор*». У выніку доўгага разбіральніцтва, якое расцягнулася амаль на два гады, Прускі дабіўся пастановы ўлад аб зносе зруба, які заклаў Банькоўскі, згодна з Арт. 414 «Гражданских законов», які забараняў выводзіць вокны на суседнія пляцы. [6, арк. 11].

Як бачна, скаргі ў момант іх стварэння былі дзейсным механізмам вырашэння ў прававым полі спрэчных момантаў, якія маглі ўзнікаць паміж суседзямі. А рэтраспектыўна нарацыя дадзенага віду дакументаў паказвае спробы чалавека зрабіць горад, або частку горада больш камфортнай для сябе – прасторнай, прыватнай, эстэтычнай і бяспечнай, паколькі блізкае

[1] «Строительный устав» – нарматыўным акт, які рэгламентаваў горадабудаўнічую сферу ў Расійскай імперыі. Першая рэдакцыя была апублікавана ў 1832 г. Быў уключаны ў XII том «Свода законов Российской империи» і за час свайго існавання перацярпеў тры рэдакцыі (1842, 1857, 1900 гг.)

[2] «Высочайше утверждённые фасады» – графічна-выяўленчыя дакументы; ўяўляюць альбомы чарцяжоў і малюнкаў, якія рэгламентавалі архітэктурны складнік горадабудаўніцтва ў Расійскай імперыі.

распалажэнне драўляных будынкаў было частай прычынай гарадскіх пажараў. У сувязі з гэтым, рэгулярнай прычынай скаргаў станавілася занепакоенасць уладкаваннем небяспечных прадпрыемстваў у жылых дамах. Напрыклад, у 1877 г. жыхарамі Ашмян быў інспіраваны цікавы для даследавання працэс, які распачаўся прашэннем вядомага мешчаніна Лэйбы Стругача, які пазней стане адным з самых багатых прадрымальнікаў беларускіх губерняў, аб адкрыцці гарэлкавана заводу ў г. Ашмяны. Для ўладкавання вытворчасці ён абраў ужо існуючы будынак – жылы дом свайго цесця Маісея Франк-Камянецкага. Мясцовая паліцыя, не ўбачыла перашкод для адкрыцця заводу, аднак «небыякавыя» ашмянскія мяшчане склалі скаргу, якую адправілі ў Віленскае губернскае праўленне. Яны былі занепакоены усталяваннем перагоннага куба на прадпрыемстве, што магло б зрабіць завод вогненебяспечным для суседзяў Маісея Франк-Камянецкага. Адначасова з гэтым іншая група ашмянскіх мяшчан направіла ў губернскае праўленне прашэнне, у якім паведамлялася, што да 1877 г. у Ашмянах мелася чатыры заводы па вытворчасці гарэлкі – Шымеля Богада, Вольфа Барона, Гіршы Дорскага і Хаіма Гурвіча. Аднак з цягам часу яны аб'ядналіся ў агульны канцэрн, які называўся фірмай Богада і Барона. Каб не дапусціць з'яўлення канкурэнта ў асобе Лэйбы Стругача, яны пачалі скардзіцца на яго, каб не дапусціць адкрыцця зводу. У калектыўным прашэнні ўказвалася, што з-за манаполіі на гарэлку жыхары Ашмянаў і ваколіц «*подвергаются недостаткам и притеснениям*» [5, арк. 3–17]. У выніку шматгадовага разбіральніцтва, скарга на небяспечнасць заводу была прызнана беспадстаўнай і яе пакінулі без наступстваў. Аднак заўважым, што досыць класічная для азначанага перыяду скарга, прычынай якой з'яўлялася, здавалася б, занепакоенасць жыхароў суседствам з пажаранебяспечным прадпрыемствам, аказалася часткай важнага гістарычнага сюжэту, які ілюструе пэўную карціну станаўлення прамысловай вытворчасці ў беларускіх губернях, апавядае аб узаемаадносінах жыхароў горада, канкурэнцыі і спосабах вырашэння канфліктаў.

Беларускія гарады пачынаючы з 1772 г. паступова траплялі ў прававую сістэму Расійскай імперыі, якая вызначалася ўласнымі, адрознымі ад мясцовай традыцыі, поглядамі на арганізацыю гарадской прасторы. Розніца датычылася як пэўных архітэктурных, так і сацыяльных складнікаў гораду. Інтэрпрэтацыя зместу скаргаў і прашэнняў дазваляе наблізіцца да разумення шэрагу праблем гарадскога насельніцтва, якія ўзнікалі з-за сутыкнення розных прававых традыцый. Беларускі горад на працягу амаль ўсёй гісторыі свайго існавання – поліэтнічная і поліканфесійная прастора. Гэта ўлічвалася ў нарамтыўных дакументах Вялікага Княства Літоўскага, якія рэгламентавалі некаторыя бакі жыцця насельніцтва да 1831/1840 г. Аднак пры ўваходжанні беларускіх гарадоў у новае прававое поле, пэўныя нарматыўныя практыкі,

якія датычыліся рэгулявання этна-канфесійнай сітуацыі ў беларускім горадзе, давалі збой. Так, у 1501 г. у прававую прастору Вялікага Княства Літоўскага трапілі цыганы – вялікі князь Аляксандр дазволіў ім сяліцца на землях ВКЛ і даў некаторыя прывілеі [1, с. 65]. Цыганы вялі пераважна качавы лад жыцця, аднак некаторыя з іх сяліліся ў гарадах і мястэчках, мелі статус мяшчан. З уваходжаннем тэрыторыі Беларусі ў склад Расійскай імперыі пачаліся спробы «асадзіць» цыганоў на пэўных тэрыторыях. Царскі ўрад залічыў іх у сялянскае саслоўе. Аднак, паколькі дадзеныя меры не мелі эфекту, пазней урад дазволіў цыганам запісвацца ў гарадскія саслоўі, у тым ліку мяшчанства, аднак для гэтага неабходна было атрымаць адмысловы дазвол [2, с. 48]. У святле дадзеных абставін досыць ілюстрацыйна выглядае прашэнне, якое паступіла у 1843 г. у Лепельскую гарадскую думу ад цыганоў Кузьмы, Сцяпана, Лявона і Ігната Грахоўскіх, Марціна і Лукі Тамарэвічаў і Івана Цыбоўскага. У дыспазіцыі было змешчана хадатайніцтва аб вылучэнні пляцу для пабудовы некалькіх дамоў у г. Лепелі. Просьбіты заверылі гарадскую думу, што маюць будаўнічыя матэрыялы, для хуткага узвядзення будынкаў; адзначылі, што ў дадзены момант вымушаны займацца «хлебопашеством» на арандаваных землях. Прашэнне мае паліфанічны змест, паколькі акрамя хадайніцтва аб вылучэнні месца для пабудовы дамоў утрымлівае прашэнне аб вяртанні просьбітаў у стан лепельскіх мяшчан, якімі яны былі «от древле» [3, арк. 17]. Дадзены сюжэт дае ўяўленне аб некаторых сацыяльных праблемах этнічных груп насельніцтва, якіх нельга выкрасліць з сацыяльнай прасторы горада.

Адзначым, што дакументаў, якія праліваюць святло на «трансфер» традыцыі ў сацыяльнай і архітэктуранай прасторы горада, не шмат, але яны ўяўляюць вялікую цікавасць для даследчыкаў, паколькі дазваляюць прасачыць, як развіваліся пэўныя гістарычныя традыцыі ў новых умовах.

Такім чынам, скаргі і прашэнні дапамагаюць даследаваць значныя пласты гісторыі гарадской штодзённасці канца XVIII – пачатку XX ст. Інфармацыйная вартасць скаргаў і прашэнняў для вывучэння гісторыі горадабудаўніцтва надзвычай высокая, паколькі адным з фактараў змен у планіровачнай і архітэктурнай прасторы горада ў перыяд, які разглядаецца, былі асабістыя або калектыўныя запатрабаванні насельніцтва. Шматлікія справаводчыя працэсы, якія датычыліся прыватнага будаўніцтва або адкрыцця невялікіх прадпрыемстваў у гарадах, як правіла, пачыналіся менавіта з прашэння асобы аб вынясенні дазволу на гэта. Скаргі і прашэнні даюць уяўленне аб бачанні жыхарамі ўласнай жыццёвай прасторы, ілюструюць іх уяўленні аб справядлівым размеркаванні гарадскіх пляцаў, паказваюць рэакцыю на планы гарадской забудовы і падсвечваюць тыя сацыяльныя праблемы, якія ўзнікалі з-за судакранання розных спосабаў нарматыўнага рэгулявання гарадскога жыцця ў Вялікім Княстве Літоўскім і Расійскай ім-

перыі. У скаргах і прашэннях часта закладзена пэўная аўтабіяграфічная, этнаграфічная, сацыяльна-псіхалагічная інфармацыя аб стваральніках дакумента, якая адсутнічае ў іншых відах крыніц і дазваляе запоўніць лакуны у даследаваннях, прысвечаных вывучэнню трансфармацыйных працэсаў на тэрыторыі Беларусі, насыціць навуковыя працы важнымі падрабязнасцямі, якія пашыраць нашыя веды аб перыядзе «доўгага XIX стагоддзя».

## Бібліяграфічны спіс


1. Вялікае княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2005. Т. 1 / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. 684 с.
2. *Дучыц, Л. У.* З гісторыі цыганоў Беларусі / Л. У. Дучыц // Беларускі гістарычны часопіс. 2003. № 3. С. 45–49.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 2620. Воп. 1. Спр. 31.
4. *Суржикова, Н. В.* Эго-документы: интеллектуальная мода или осознанная необходимость? / Н. В. Суржикова // История в эго-документах: Исследования и источники / Ин-т истории и археологии УрО РАН. – Екатеринбург: Издательство «АсПУр», 2014. 368 с.
5. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (LVIA). F. 382. Ap. 1. B. 137.
6. LVIA. F. 382. Ap.1. B. 686.


УДК 327:930(4)

# АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫХ І САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ ПРАЦЭСАЎ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921–1939 гг. (БЕЛАРУСКАЯ І ПОЛЬСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ КАНЦА 1950-х – 2000-х гг.)


**Л. Ч. Дрожжа**

*Дзяржаўная ўстанова «Беларускі навукова-даследчы цэнтр электроннай дакументацыі» Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, вул. Ф. Скарыны, 51, корп. 2, 220082, г. Мінск, l_drojja@mail.ru*


Разгледжана сучасная беларуская і польская гістарыяграфія па фарміраванню і асноўным напрамкам грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця насельніцтва Заходняй Беларусі ў перыяд 1921–1939 гг. і пераўтварэнням пасля гістарычнага ўз'яднання з БССР у верасні 1939 г. Прааналізаваны характэрныя рысы сучаснага этапа развіцця заходнебеларускай праблематыкі беларускімі і польскімі гісторыкамі па вывучэнню становішча ва ўсходніх ваяводствах Другой Рэчы Паспалітай нацыянальных меншасцей, эканамічнай і сацыяльнай палітыкі польскіх уладаў, рабочым руху, пераследу актывістаў КПЗБ і інш.

***Ключавыя словы:*** Заходняя Беларусь; беларуская гістарыяграфія; польская гістарыяграфія; заходнебеларуская праблематыка; грамадска-палітычныя працэсы; сацыяльна-эканамічныя працэсы.